Маланка 1926

Паасобныя №№

ГОД ВЫДАНЬНЯ ПЕРШЫ

АСОБНЫ НУМАР 40 ГРОШ.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Завальная вуліца, № 7
Беларуская Кнігарня. «МАЛАНКА»

№ 5
1 САКАВІКА
1926 г.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
на 1 год 8 злот.
„ паўгоду 4 „
„ тры мес. 2 „
„ адзін м. 1 „

За граніцу: на год—тры даляры, на паўгоду—1 д. і 50 цэнт.

Польскі дыплёмат: Пусьцеце мяне „хамы праклятыя“, — я прадстаўнік вялікае 27-мільённае Польшчі адзеля таго павінен заняць сталае месца ў Лізе Народаў!

Наыя. меншасьці: Дудкі, браце, — дай нам перш усё, што нам па праву належыцца, а то храк пазярм, а ня пусьцім.

Рад-бы ў рай ды грахі ня пускаюць!

([illegible] „Каробочка")

Скшынск:

Ой, поўнюсенька ты, скрыначка
Загранічных пашпартоў;
Пажалей мяне ты, Францыя,
Бо у Лігу я гатоў.

Там сядзець я буду з Англіяй,
На немца скоса паглядаць,
Мусаліняга крывавага
У чорныя ручкі цалаваць.

Як надобга там расьсядуся,
На ўвесь сьвет я закрычу:
„Ціха, меншасьці праклятыя,
„Бо галовы вам скручу!"

Англія:

Ціха, ціха, не расходзься так, —
Невялікі яшчэ пан!
Сьвет пазнаў твае ўсе хітрыкі
І хлусьню тваю — абман.

Лепей зубы сашчаміўшы
Ты сядзеў-бы і маўчаў,
І куды цябе ня просяць
Свайго носа ня суваў!

Бо ў сваім уласным краі
Ты ня можаш ладу даць,
А бярэшся прагавіта
Цэлым сьветам кіраваць!

Нацыянальныя меншасьці:

Не, брат, стой! куды сьпяшаешся?
Нас ты хочаш абмінуць, —
Хоць дробным макам рассыпаешся,
Месца ў Лізе не дадуць!

Скшынск ([illegible]):

„Захацеў я ў Лігу,
„Але далі фігу;
„Мяне нідзе ня пускаюць, —
„Паеду у... рыгу!..

Я. М.

Сьмейся, браце!

Сьмейся, браце беларусе,
Сум далоў гані!
Не кажы: „я ўсіх бядне"...
Вечна не стагні.

Не паможа бядзе гора,
Ліха не памрэ
Годзі з сьлёз рабіці мора,
Засьмяяцца трэ,

Каб разьвеяць непагоду
Нашага жыцьця,
Каб у рогаце свабоду
Нам пачуць хаця!

Бо сьмяяцца толькі й можа
У сьвеце чалавек
А ці-ж наш народ прыгожа
Зложаны з калек?

Не! мы людзі, браце мілы,
Людзі, як і ўсе,
Тыя, хто нас часам сілай
Цісьне і трасе.

Не дарма-ж мы і гаруем —
Лепшы лёс куём,
Ліха сьмехам зачаруем,
Песьняю даб'ём.

І нарадзіцца вось доля
Лепшая для нас
Прыйдзе весялосьць і Воля
У недалёкі час.

І пад новых песьняў гукі,
Крыкі чуць пазьней,
З [illegible] гукі
Нацыя [illegible].

Краўцоў Макар.

ЖАРТЫ.

Ня слухае.

Маткі: Глядзі, Сымонька, ня будзь такой натуры, як твой татка, — калі дзе трэба, дык цмокні пана у ручку... но помні, што ласкавае цялятка дзьве маткі ссе!

Сын: Ці ж праўда? А я чуў, што ўсіх тых дурных машына парэзала, што паном, папом, ксяндзом у рукі цалавалі, дык і я баюся, каб і са мной тое ня сталася,. — хай яму лепей тая рука адсохне, калі ж.

— Не, сыночак, нічога злосьцяй ня зробіш, усюдых трэба пакорай...

— Але вун наш конь бо ляны занадта пакорны, — дык у хамуце ходзіць!

???

— Што трэба зрабіць, каб спалян заваць беларусаў?

— Перад усім трэба іх зазнаёміць прымусова з нашай высокай асьветай і нашымі заходня эўрапэйскімі і стытуцыямі, а калі гэта будзе немагчымы, можна будзе пашыраць асьвету ў крыміналe, турмах, лякішках, паліцэйскіх і вайсковых пастарунках, дый у іншых установах і усюды трэба старацца, каб ясна ўваччу рабілася целярусам..

Кул

Грамадзяне!

Рэдакцыя стараецца з кожным нумарам паляпшаць „Маланку“, але цяжкае матар'яльнае становішча гэтаму на перашкодзе. Дык падпісвайцеся самі і заахвочвайце сваіх суседзяў да падпіскі.

Хай пашыраецца Ваша родная Маланка“. (Падпісная цана на тры месяцы — 2 злотыя).

Адрэс: Вільня, Завальная вул. №7

Рэдакцыя „Маланка“.

Сварка.

Ганна з Мартай мелі сварку.
— Ты дурніца! — Ты ведзьмарка!
— Така сама, дабрадзейка!
Слухаў чорт вось гэта, слухаў.
Дый матаў сабе на вуха
і шапнуў праз зубы, ледзьве:
„Ну і ведзьмы ж вы абедзьве!“

П. М.

УСЕ ЛАЮЦЬ.

У Варшаве праходзіць вуліцаю міністар Грабскі і бачыць, што натаўп абступіў некага арыштованага:

— Пусьцеце яго! пусьцеце! — крычаць.

Зацікаўлены міністар затрымаўся і пытаецца ў паліцыянта

— За што арыштавалі гэтага ягамосьця?

— Ён лаяў парадкі і дзяржаву...

— Няпраўда! — крычыць натаўп, — ён лаяў толькі Грабскага!

— Калі так, дык можаце яго пусьціць. Мяне і без таго ўсе лаюць.

„Зил“.

„Грамадзкая“ кнігарня.

Калісь я напісаў поэму.

Надрукавалі..

Але таму што ў выдавецтва гатоўкі не хапала на тое, каб ёю выплаціць мне гонорар, дык я мусіў згадзіцца на гэткія варункі:

Выдавецтва плаціць мне, што можа, а рэшту ўмоўленае сумы маецца сплаціць праз „сваю“ кнігарню, як толькі будзе праданы пэўны лік экзэмпляраў надрукованае поэмы на патрэбную суму.

І гэта добра. Кніжкі таксама — капітал..

Прайшло два гады. Настаў агульны эканамічны крызыс, які мяне далёк хіба наймацней за кожнага з грамадзян Рэчыпаспалітай.

Бо я грамадзянін, але так сабе нейкага III гатунку. Па мэтрыцы — праваслаўны, па нацыянальнасьці — беларус, па пераконаньнях...

Але ж тпру!..

Далёка запісаўся.

Лепей прамаўчаць...

Іду да пана Кнігара, да нашага грамадзкага кнігара, пастаўленага ведаць справамі нашае беларускае Кнігарні ў самым належным грамадзкім парадку.

— Так і так, — кажу, — пане Кнігару.

Крызыс.

Безрабоцьце.

Недаед.

Нуда.

Ёсьць тут недзе за Вамі г. знач. за Кнігарняю рахуначак. Заплацеце, што можаце. Колькі там разыйшлося мае поэмы?

— Ды цяпер усё жыцьцё масьль... Э, ды што я хацеў сказаць, — нудзьліва адказваў п. Кнігар, — усё жыцьцё цяпер — поэма. Гэта-ж ня жарт. Во, во, во!..

Пачаў мне паказваць кнігар розныя „наказы платнічэ“.

На маё шчасьце, ў Кнігарню зайшла адна з галоваў Выдавецтва. А кнігарня наша лічылася ўласнасьцю гэтага выдавецтва.

Я ізноў спачатку: — Крызыс і г. д. Экзэкуцыя, ратуй!

Галава паважным тонам дала зразумець кнігару, што мне выплаціць трэба. Няшмат-жа там..

Кнігар дакляраваў .. *каля першага*... Праўда, што пасьля дакляраванага *першага*, месяца цераз паўтара я адтрымаў ад яго на... цукер і гарбату.

Скумячыўшы грошы, я ўцешыўся, што ўжо лёд пайшоў — выплата гонорару пачалася.

Але ў тую ж ноч прысьніўся мне п. кнігар.

Куды падзелася яго флегматычнасьць?

Вясёлы, адважны, шустры і хітры, як ліс, ён стаяў за сваім прылаўкам у „сваёй“ кнігарні і моцна некаму грозіў абедзьвюма, паднятымі ўгару, рукамі

— Што, — крычэў п. кнігар — Фігу вам... Выдавецтва? Якое выдавецтва? Кнігарня мая! Забірайце сабе свае кніжкі, якіх я яшчэ не пасьпеў прадаць! А мне што? Кватэра мая, патэнт мой, падаткі я плацілў. А ці плаціў хто мне? Я-ж служыў, служыў у Выдавецтве. Некалькі гадоў! Дзе мая пэнсія?

У глухой провінцыі, у адзінотнай хатцы прабудзіў мяне сьвіст ветру, ўдараўшага ў вокны.

Я пачасаў патыліцу й падумаў:

— „Бывай! ты, мілая поэма!“...

Звончык.

Нічога У Польшчы не паправілася...



Быў міністар Грабскі, што падаткі зграбаў...



... а пасьля настаў міністар Скшынскі, што замкнуў у скрынку.

Як у нас разумеюць „панскую гутарку“.

Вязе сялянін гонты, а насустрэч едзе пан.

— Звруць з дрогі! — гукае пан.

— Не, ня вельмі дарагі, тры злотых за капу.

— Сконт ты? — пытае пан.

— Але, але, паночку, за гонты! — адказывае сялянін.

— З якей ты всі? — пытае пан сярдзіта.

— Дзе там у чорта ўсе, яшчэ за тры вазы не забярэш!

— З дарогі зьедзь, доўганосы! — злуе пан.

— Калі ласка! — адказаў селянін і ўзяў свой нос ды павярнуў у старану кажучы:

— Едзь, панок, калі табе мой нос перашкаджае! М.

Сучасныя бандыты.

Абшарнік-паляк Канстанты Развадоўскі, валадар маёнтку Людзікова, Драгічынскага пав., Берасьцейскага ваяв., давядаўшыся аб тым, што сялянка Матрунка Кравец адтрымала з Амэрыкі значнае адшкадаваньне за свайго забітага на вайне мужа, уварваўся разам з хурманом увечары у яе хату ў в. Злоча. Напаўшы на Краве , якая была адна ў хаце, і схапіўшы яе за горла, „прыраджоны валадар бандыт загадаў свайму хурману шукаць даляраў...

(„Беларуская Ніва“ 25. II 26 № 16)

Польскі барон Ян Бісьпінг на сваім судовым працэсе ў Варшаве сам прызнаўся:

што ў канцы 1918 году асабіста падпаліў вёску Рымуцеўцы ў Горадзеншчыне), ў якой было 27 хат і ўласнаручна застрэліў з рэвальвэра аднаго селяніна, (а адзін селянін быў хворы на тыфус і згарэў у падпаленай Бісьпінгам хаце).

(„Беларуская Ніва“ 10. II. 27 № 11)

Дзе знайсьці „працу?“

Каля мясцовага рынку галі— спаткаліся два безработныя:

— Працуеш? — пытаецца адзін.

— Дзе там? — адказвае бядак.

— Дык зайдзі ў „Часовую Раду“ (гэтак цяпер завуць готэль Сакалоўскага на Нямецкай вуліцы).

— А што?

— Ды патрэбны там беларусы.

— Нашто?

— А чорт іх там ведае! Мусі, каб „раду“ гэтую зрабіць.

-- Але-ж я — расеец?...

— Якраз гэткія там і патрэбны. Сып, браце! Не марнуй часу.

— А ніхто яшчэ ня ведае.

А ні дух!

— Колькі-ж плацяць?

— Таргуйся і бяры наперад, бо ашукаюць, як і мяне.

Бадзяка.

На сьледстве.

Сьледчы судзьдзя робіць агляд месца, дзе быў зроблены праступак, а яго пісар запісвае ў пратакол:

„ . . на стале знайшлі бутэльку з зуброўкай...“

— Э, пачакайце, — кажа сьледчы, — трэба-ж пакаштаваць, ці тут праўдзівая „зуброўка“? Гэта вельмі важна для справы.

Пакаштаваў і кажа:

— Пішэце, што „ў бутэльцы была „зуброўка“.

— Не, гэта, здаецца, ня „зуброўка“, а „пярцоўка“, — кажа пісар і здорава глынуў з бутэлькі.

— Ня можа быць!? - зьдзіviўся сьледчы і яшчэ прылажыўся да бутэлькі.

— А што? „пярцоўка“—стараўся пераканаць яго пісар і яшчэ глынуў са смакам.

Сьцісну́ў плячыма сьледавацель, ды кажа:

— Пішэце ў пратакол, што на стале знайшлі парожнюю бутэльку і ніяк не маглі даведацца, што ў ёй было.

Г. Л.

З баданьня.

Доўга я вачам ня верыў,
Як ад солтыса паперу
Адтрымаў учора зраньня
Каб ісьці ўраз на баданьне.

Хоць ня хочаш, ісьці трэба.
Узяў я ў торбу кусок хлеба,
Ускінуў, вось, на плечы клунак
І пайшоў на пастарунак.

Як прышоў я, — прывітаўся,
Ды ніхто не адазваўся,
Паглядзелі, як на зьвера,
Адчынілі нейкі дзьверы

І упхнулі у катух,
Дзе смурод і цяжкі дух;
Цёмна, глуха і халодна, —
Цэлы дзень сяджу галодны,

А за што і сам ня знаю?
Ды надумаў: запытаю:
За што тут цярплю я зьдзек? —
Я нявінны чалавек!

„Хадзі, хаме, цябе клічуць, —
„Там табе грахі палічаць,
„Скажуць усё як і што?
„Там пазнаеш ты *„за што“?*

Завялі мяне ў пакоі
І дзяругаю якоюсь
Мне закрылі твар і вочы. —
Стала цёмна, як ўночы.

Завалілі на падлогу;
Адзін б'ець, двух на падмогу
Мяне кіем акладаюць
І „прызнайся!“ ўсё пытаюць.

Далей памяць адабрала.
Як прачхнуўся, ўжо сьвітало.
Гляджу ўвесь, як кл[illegible]ка зьбіты,
Крывёй уласнаю абліты.

Толькі мала агледаўся —
За дзьвярмі хтось адазваўся:
Калі я не вінаваты, —
Каб пашоў сабе да хаты.

Янка М.

Крапіва.

На „Крэсах Усходніх“.

Пан клапоціцца на „крэсах“,
Аб чыіх ён інтарэсах? —
Можна бачыць і сьляпому —
Не аб нашых жа вядома,
Воўчы зуб не памагае,
Дык палітыка другая
У яго, як бач пасьпела —
Хвост пусьціць лісіны ў дзела;
Ходзіць, губкамі мыляе,
Конституцыяй віляе,
Мажа губы, гладзіць вусы
Ен хахлу і беларусу:
Мы вас любім, мы вам рады,
То чыноўнікі ўсе гады
Вас там крыўдзілі дагэтуль —
Мы пакажам ім за гэта...
Вось вам цацак (папяровых),
Вось вам школы, вось вам мовы...
Ходзіць пан лісой — хітрушкай
Перад крэсаваю птушкай.
Беларус, глядзі ня каркай,
Бо адчуеш сваім каркам,
Чаму пан такі стаў добры:
Кось-кось-кось — пакуль ў аглоблі,
Потым па баку дугою
Ды ў жывот яшчэ нагою.

Як ня прыкра, але праўда.

Мікіта вязе воз збожжа. Калёсы пішчаць. Кабылка бабулька часта становіцца. Мікіта, аднэю рукою, ўпёршыся ў ручку, папіхае, а другою сьцёбае кабылку.

Куды гэта, Мікіта? — пытае Марцін.

— К папу. Ось жаню сына. Прыходзь на вясельле.

— Каб ты запуставеў.. Ці ж ня можна было-б другі раз завязьці. Пэўна пудоў 20 будзе?

— „Дваццаць пяць“ — насілу прагаварыў Мікіта.

— А шмат яшчэ засталося? — зацікавіўся Марцін.

— „Дзе там засталося, пудоў пяць пазычыў. Але ж цяпер вясна, як-небудзь крапіўкаю пераківаемся да новага“. (Як ня прыкра, але праўда.)

Сякі — так.

Махорка.

Дзядзька з люлькай сеў ля хаты, йшлі па вуліцы салдаты.

— Добры вечар, дабрадзей!
Прыкурыць дай з люлькі той.
Прыкурылі, — пашлі проч.
Дзядзька сплюнуў і бармоча:
— Ліхім ветрам занясло
На мяне такое зло —
Папяроскай, шарлатане,
Усю махорку запаганіў.

П. Маслоўск.

Стары і сьмерць.

Прэ дзядок старэнькі з лесу
Дроў бярэмя, як падняць,
Чыста змучыўся, спацеўшы
Сеў на ім адпачываць.

Сеў дый кажа: — „Эх, пакута!
Вось прыждаў пад старасьць
лет...
Каб хутчэй як сьмерць забрала
Мяне згэтуль на той сьвет“.

Калі гляне — сьмерць пад бокам,
Аж затросься мой стары,
„Тут я, — кажа, — дабрадзею,
Чаго клікаў без пары?...

— Ды я вось... кажу... аб тое...
Стаў старэнькі лепятаць
— Бачыш вось... каб дроў бярэмя
Мне пасобіла падняць.

Міхась Васілёк.

Крап ва.

Ігрышча.

Нешта сёньня у Агаты
Лямпа весела гарыць,
А людзей дык поўна хата, —
Так, як дзьверы зачыніць.

У яе, бач, грышча сёньня,
Дык сышлася вёска ўся;
Сьцёпка ціскае гармонік,
Той пішчыць, як парася.

А пад піск тэй сярод хаты
Дык аж стогнуць, бо аруць.
Скачуць хлопцы і дзяўчаты —
Вобуй бацькаўскі дзяруць;

Усе сапуць, абліты потам,
Як улетку у сенакос;
Як каторы топне ботам, —
Здаецца, зломіцца памост.

Як ідзе ж Паўлінін Тодар,
Дык аж дзівяцца ўжо усе:
Да работы, здаецца, лодар, —
Тут, як чорт яго нясе.

А вакол стаяць дзяўчаты.
Шмат хлапцоў, мужчын. каб т,
Тут сынок ды тут і тата,
Тут і ўнучак, тут і дзед

Між вялікіх лазяць дзеці,
Так, як мышы між снапоў.
Ім вядома ўсё на сьвеце,
Хто што робіць з дзяцюкоў:

Дзе дзяўчыну хто абніме,
Пацалуе, ці ўшчыкне —
Не схаваешся за імі
Ты ні ў сенцах, ні ў гумне.

Гоман, крык стаіць вялікі,
Сьмех дзяўчат і дзяцюкоў,
Падчас лаянка і дзікі
Град адборных мацюкоў.

Белз-сіні, надта горк
Лезе ў вочы, есьць да сьлёз,
Душыць горла дым махоркі,
Самагон зрывае нос.

Вось — забава для вялікіх,
Вось — навука для малых:
Ў самагонцы, скоках дзікіх,
Ў мацюкох заместа кніг.



Чаму-ж мне ня гуляць?
І не баляваць?
Калі ж у маіх кішэнях
Грошыкі бразджаць!

Калі на мяне работнікі
Цурком пот льлюць
І хоць самі з голаду
Ня жывуць — гніюць,

Сваю працу цяжкую
Пану аддаюць!
Чаму-ж мне ня гуляць?
І не баляваць?

Калі мне з „банку польскага"
Грошыкі ляцяць!
Як ня хоціць фабрыкаў,
Грошы прападуць, —

Мне пазычку добрую
Са скарбу дадуць,
А як праматаю ўсё, —
Яшчэ дададуць!

Чаму-ж мне ня гуляць?
І не баляваць?
Бо мне, *пану вялікаму*,
На ўсё напляваць'..

Янка М.

РОЗЬНІЦА.

— Адгадай мне, Яўхім, чым розьніцца блыха ад падаткаў?

— Ніякае розьніцы: блыха кусаецца і падатак кусаецца!

— Не, ня ведаеш! Ёсьць розьніца: падатак грызе чалавека праз увесь дзень, а блыха праз усю ноч.

М. Г.

Дарадзіла.

„[illegible] — к[illegible] выганяй!"
(народная прыказка).

Курыў Антон на печы люльку,
Крактаў, сап і усё смаркаўся,
А больш з-за коміна на Юльку
Ён левым вокам углядаўся.

На лаве кужаль Юлька прала,
Антона ўчуўшы енк ды стогн,
Нязнаўшы справы ў чым спытала:
— Чаго ты войкаеш Антон?

— Жывот штось ведаеш, бунтуець,
Мо' зельле маеш, дык давай,
А то хоць ж болей паратуець...
А не, дык сьмерці вось чакай!

Відаць, што Юлька зельле мела
[illegible]...
Як толькі Юлька з печы зьлезла,
Дык перастаў Антон стагнаць.

Казалі толькі, што бяз мала
Ад тэй пары амаль за год
Юлька крэпка охі стагнала;
Бедная ёй балеў жывот.

Я. Башкір.

Цікавае здарэньне.

Пан ехаў самаходам да двара. Раптам, на завароце дарогі, ўбачыў шофэр нейкага чалавака са стрэльбай, а з боку яго ішоў сабака. Чалавек гэты пасьпеў асьцерагчыся, адскочыўшы ўбок, а сабака папаўся пад колы самаходу і згінуў на месцы.

Пан затрымаў машыну і пытаецца ў таго чалавека:

— Перапрашаю, ці гэта ваш сабака?

— Але, мой!

— Ці вы ёсьць яго праўны ўласьнік?

— Але, — я!

— Пераехалі мы яго! Але, здаецца мне, што гэты сабака быў надобрай пароды і ня вельмі дарагі?

— Але, але!

— Ці хопіць вам за яго 20 злотых адшкадаваньня?

— Хай будзе так!

Чалавек схаваў грошы ў кішэнь, ветліва пакланіўся і хацеў адыйсьці, а пан яму кажа на разьвітаньне:

— Перапрашаю, што папсаваў вам паляван не...,

— Паляваньне? Якое там паляваньне?! Гэты сабака быў вельмі стары і да ніякага паляваньня няздатны, — вось я яго і вёў да лесу, каб яго самога застрэліць.

Ня будзь пэўным!

— Ты куды сьпяшаешся?
— Лячу у суд!
— Дык мы з табой няхутка ўбачымся?
— Чаму? — Я хутка вярнуся!
— Не, братка, ня можна ручацца. Мой адзін знаёмы пайшоў на пару гадзін, а вярнуўся... цераз два гады

Ст. С.

У судзе.

Судзьдзя: — Ці ведаеш што гусі вельмі кепска красьці?
Злодзей: — Але, ведаю, пане судзьдзя! Яны вельмі крычаць.

Чаму?...

— Чаму гэта англічане і немцы ня хочуць пусьціць Польшчы у Лігу Народаў?
— Яшчэ Польшча не папала ў Лігу, а ўжо дала нам фігу, а калі будзе засядаць, дык дасьць нам цэлых пяць.

Янка М.

Усё йдзе паводле новага календара.

Сьвякроў сварыцца з нявесткаю, ды зьняважае яе:
— Іш ты, брыда! якою была да шлюбу, такой засталася й цяпер: абы ўбачыла дзе хлапца, дык зараз жарты заводзіць!
— Што, мамка, наракаеце, — можа перад шлюбам што недарэчнае зрабіла?
— А можа не?! На веснавога Міколу шлюб брал, а ў два тыдні пасьля Валохрышча хрысьціны былі
— Маўчы старая, — адгрызаецца нявестка. У вас усё паводле старога календара, а я жыву пановаму.

Стары Чмель.

На вуліцы.

— Трымайся, сынок, за сукенку, а то застанешся!
— Калі-ж, мамка сукенка вельмі кароткая, — не дастану.

Гадзіньнік — мой!

— Ах вось бяда!
— Якая?
Ды вунь у таго пана, што ў зялёным капялюшы, жулік нядаўна залаты гадзіньнік выцягнуў.
— Ну, а табе што да гэтага, чаго ты бядуеш?
— Як чаго?! Гэты гадзіньнік, дык ужо быў мой.
— Якім парадкам?
— Гэта-ж я прабіраўся яго перш украсьць!

С Ч

Жа балі.

На, вось, гэты цудоўны брылянтовы пярсьцёнак. Каб яго набыць для цябе, дык звольніў з фабрыкі ізноў пяцьдзесят работнікаў.

(Micha)

Ад чаго вецер?

— Скажы, дзядзька, з чаго вецер робіцца?
— Вось, дурань! Зірні угару, што там ёсьць?
— Неба!
— А ўнізе?
— Зямля!
— А пасярэдзіне?
— Дый нічога!
— Дык вось вецер дзьмухае, — скразіць!

С. Ч.

Рэдактар-выдавец Янка Касяк
Друкарня Б. Клецкіна, Вільня